

# Прынцыпы нулявой талерантнасці да сексуалізаванага харасменту ў грамадзянскай супольнасці

## Дакумент падрыхтаваны Прававой Ініцыятывай у супрацы з Настай Базар і грамадзянскай супольнасцю Беларусі.

Мы прызнаем, што сексуалізаваны харасмент і іншыя формы гвалту ў грамадзянскай супольнасці Беларусі з'яўляюцца сістэмнай праблемай. Яны падрываюць давер, заахвочваюць культуру гвалту, узмацняюць стыгматызацыю і замінаюць развіццю супольнасці. Мы перакананыя: маўчанне і ігнараванне выпадкаў харасменту недапушчальныя. Стварэнне бяспечнага асяроддзя – гэта аснова нашай працы і маральны абавязак кожнай і кожнага. Гэта не проста дэкларацыя, а аснова даверу і супрацы.

Кожны чалавек мае неад'емнае права на павагу, бяспеку і абарону ад любых формаў гвалту і дамаганняў. Любая праява харасменту – словамі, фізічна, лічбава ці псіхалагічна – недапушчальная і супярэчыць базавым прынцыпам роўнасці, справядлівасці і чалавечай годнасці.

Гэтыя прынцыпы прапанаваныя арганізацыям, ініцыятывам, медыя і асобным прадстаўніцам і прадстаўнікам грамадзянскай супольнасці Беларусі, як знутры краіны, так і ў эміграцыі.

**Тыя, хто падпісвае іх, бяруць на сябе прафесійна-этычны абавязак спрыяць фармаванню культуры нулявой талерантнасці да харасменту і сумесна падтрымліваць паважлівае ўзаемадзеянне.**

Поўны збор паняццяў, прапісаных тут, вы можаце знайсці ў асноўным дакуменце ў другім раздзеле па **спасылцы**.

## Мы абавязваемся выконваць наступныя прынцыпы:

**1** **Недапушчальнасць сексуалізаванага харасменту.**
Мы супрацьдзейнічаем любым формам дамаганняў – словамі, фізічна, лічбава, структурна і інш. (поўны пералік відаў гвалту можна знайсці ў асноўным дакуменце ў раздзеле 2). У любых прасторах, як анлайн, так і афлайн, незалежна ад кантэксту, харасмент недапушчальны.

**2** **Павага межаў і недапушчальнасць злоўжывання ўладай і статусам.**
Фліpт і/ці адносіны рамантычнага характару могуць ствараць сітуацыі ўразлівасці там, дзе ёсць адносіны ўлады, розніца ў статусе ці залежнасць. Калі паміж людзьмі з няроўным статусам (напрыклад, кіраўніцай ці кіраўніком і падначаленай ці падначаленым) узнікаюць адносіны рамантычнага характару, пра гэта варта адкрыта паведаміць адказнай асобе ці калектыву, а прамое падпарадкаванне па магчымасці ўхіліць, каб пазбегнуць канфлікту інтарэсаў. Адказнасць за этычныя паводзіны нясе асоба, якая валодае большай уладай ці статусам.

3

**Недапушчэнне віктымблэймінгу (перакладання віны на пацярпелы бок).**

Адказнасць заўжды ляжыць на чалавеку, які нашкодзіў. Мы выключаем практыку абвінавачвання пацярпелых і недаверу іх вопыту. Любы ціск на пацярпелы бок і/ці сведкаў з мэтай замоўчвання сітуацый сексуалізаванага харасменту недапушчальны. Мы падтрымліваем права пацярпелага боку самастойна вырашаць, расказваць пра тое, што адбылося, публічна ці не.

4

**Забарона рэталіяцыі (пераследу тых, хто паведаміў пра харасмент).**

Ніхто не можа быць пакараны, зацкаваны ці выключаны за паведамленне пра харасмент ці падтрымку пацярпелых.

5

**Празрыстыя механізмы рэагавання.**

Мы прызнаем важнасць існавання зразумелых незалежных і экспертных каналаў для падачы скаргаў, працэдураў іх разгляду і прыняцця рашэнняў. Любая арганізацыя ці група павінна мець ясныя правілы: куды можна звярнуцца, як разглядаецца скарга і ці ўдзельнічаюць у гэтым незалежныя і навучаныя эксперткі і эксперты, як забяспечваецца канфідэнцыйнасць, а таксама якія меры прымаюцца па рэалізацыі прынятых рашэнняў.

6

**Мы абавязваемся надаваць маральную, псіхалагічную і арганізацыйную (адміністратыўную) падтрымку** пацярпелым ад харасменту, паважаючы іх выбар, патрэбы і ўзровень гатоўнасці да камунікацыі. Пад маральнай падтрымкай мы разумеем прызнанне перажытага, паважлівае стаўленне і салідарнасць; пад псіхалагічнай – доступ да кваліфікаванай дапамогі спецыялістак і спецыялістаў; пад арганізацыйнай – стварэнне бяспечных умоваў, дакументаванне, дапамога ў звароце і абароне правоў. Першасны

абавязак рэагаваць і забяспечваць такую падтрымку ляжыць на арганізацыі, унутры якой адбыўся інцыдэнт, аднак усе падпісанткі і падпісанты гэтых прынцыпаў лічаць сваім абавязкам садзейнічаць пацярпелым і, пры неабходнасці, далучаць знешнія рэсурсы і прафесійную дапамогу.

7

**Інклюзіўнасць і клопат пра бяспеку.**
Мы прызнаем, што такія групы як жанчыны, ЛГБТК+ людзі, моладзь, людзі старэйшага ўзросту, людзі з досведам міграцыі, сола-маці і сола-бацькі, людзі з інваліднасцю і людзі іншых сацыяльна-ўразлівых груп схільныя да большай рызыкі ў сітуацыях сексуалізаванага харасменту. Таму мы імкнемся ствараць умовы, пры якіх гэтыя групы будуць адчуваць сябе ў бяспецы і мець роўнае права голасу пры абмеркаванні пытанняў, звязаных з унутранай культурай, палітыкамі бяспекі і ўмовамі ўдзелу, і пры прыняцці арганізацыйных рашэнняў.

8

**Адкрытасць і самарэфлексія.**
Мы прызнаем, што любыя супольнасці схільныя да здзяйснення памылак. Гатоўнасць да абмеркавання праблемаў, навучання і змены практык – важны крок да фармавання бяспечнага асяроддзя.

9

**Адказнасць лідарак і лідараў.**
Кіраўніцы і кіраўнікі, каардынаторкі і каардынатары і іншыя асобы, якія прымаюць рашэнні, павінны падаваць асабісты прыклад, сачыць за выкананнем гэтых прынцыпаў у сваёй арганізацыі ці ініцыятыве, своечасова рэагаваць на скаргі і ствараць атмасферу даверу і бяспекі.

## 10 Адказнасць арганізацый, прадстаўніц і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці.

Арганізацыі і асобы, якія падпісалі дадзеныя прынцыпы, бяруць на сябе абавязак прытрымлівацца іх, а таксама дзейнічаць празрыста і справядліва, са згоды пацярпелага боку.

## 11 Прафілактыка харасменту і адказнасць супольнасці.

Мы лічым, што адказнасць за прадухіленне сексуалізаванага харасменту ляжыць на кожнай арганізацыі, кожнай удзельніцы і кожным удзельніку грамадзянскай супольнасці. Недапушчэнне дамаганняў патрабуе не толькі рэагавання на інцыдэнты, але і пастаяннай прафілактычнай працы. Стварэнне бяспечнага асяроддзя немагчымае без ініцыятыўнага ўдзелу кожнай і кожнага. Мы абавязваемся рэагаваць на праявы харасменту, падтрымліваць пацярпелых, спрыяць фармаванню прасторы роўнасці і даверу, падтрымліваць культуру паважлівага і адказнага ўзаемадзеяння ў грамадзянскай супольнасці, забяспечваць рэгулярнае навучанне супрацоўніц і супрацоўнікаў, а таксама ўдзельніц і ўдзельнікаў пра тое, што такое харасмент, як яго распазнаваць і як на яго рэагаваць. Прафілактыка – гэта калектыўная задача, скіраваная на ўмацаванне даверу, годнасці і бяспекі ўсіх удзельніц і ўдзельнікаў супольнасці.

Гэтыя прынцыпы дапамагаюць грамадзянскай супольнасці Беларусі наладжваць бяспечныя, паважлівыя і справядлівыя супольнасці, дзе кожны чалавек адчувае сябе абаронена і можа дзейнічаць без страху і ціску. Прытрымліванне гэтых прынцыпаў – гэта, перш за ўсё, пытанне павагі да чалавечай годнасці, правоў і бяспекі кожнай і кожнага. Толькі ў такім асяроддзі магчымы сапраўдны давер, супраца і салідарнасць, якія робяць каманды і арганізацыі мацней.

**Вы можаце далучыцца да гэтых прынцыпаў як арганізацыя, так і як фізічная асоба, якая актыўна задзейнічаная ў дзейнасць беларускай грамадзянскай супольнасці ў эміграцыі.**

**Падпісанткі і падпісанты будуць фіксавацца ў двух спісах: публічным (для адкрытага распаўсюджвання) і непублічным (для ўнутранага захоўвання), што неабходна з меркаваннаў бяспекі. Калі вы хочаце далучыцца ананімна, калі ласка, звяжыцеся з Прававой ініцыятывай <u>па электроннай пошце</u> ці праз <u>Telegram</u>.**

1. Прававая Ініцыятыва ______________________________
2. ______________________________
3. ______________________________
4. ______________________________
5. ______________________________
6. ______________________________
7. ______________________________
8. ______________________________
9. ______________________________
10. ______________________________
11. ______________________________
12. ______________________________
13. ______________________________
14. ______________________________
15. ______________________________
16. ______________________________
17. ______________________________
18. ______________________________
19. ______________________________
20. ______________________________